

# ПОСПЕХ

***Імкніся ставіцца да людзей так, як хочаш, каб яны ставіліся да цябе***

## *У НУМАРЫ:*




**С. 2-6. МЕРКАВАННІ: Сем ключоў да поспеху. Меркаванні адзінаццацікласнікаў СШ № 2 горада Паставы**



**С. 7. ТЭСТ: «Хто ты такі?»**



**С. 7. ПАРАДЫ: «Як стаць паспяховым» ад Стыва Джобса**



**С. 8-10. ПАРАЎНАННІ: Спроба параўнання беларусаў і амерыканцаў у артыкуле Наталлі Пракаповіч**



**С. 11-12. АСОБЫ: Зыгмунт Чаховіч - паўстанец, пакутнік, духоўны бацька Янкі Купалы ў артыкуле Ігара Пракаповіча**

# SUCCESS

## КЛЮЧЫ ДА ПОСПЕХУ



ШЛЯХ ДА ПОСПЕХУ
Ў НАШЫМ УЯЎЛЕННІ І НА САМОЙ СПРАВЕ





СВАБОДА



ЛЮБОЎ



ЗДАРОЎЕ





АДУКАЦЫЯ

ПАЗІТЫЎНЫ НАСТРОЙ





КАМУНІКАТЫЎНЫЯ НАВЫКІ

МЭТА

## Поспех - гэта актыўны ўдзел у жыцці грамадства

Каб быць паспяховым, трэба жыць у дэмакратычнай краіне, бо сацыяльна-эканамічныя ўмовы фарміруюць паводзіны людзей. Дзяржава (улада) можа альбо абараняць сваіх грамадзян, альбо чыніць шкоду іх фізічнаму, эмацыйнаму і псіхічнаму здароўю. Таму немагчыма быць паспяховым у несвабодным грамадстве. Каб стаць паспяховымі, мы павінны ведаць свае правы і абавязкі і быць у стане абараняць дэмакратычныя каштоўнасці, бо гэта важна для агульнага дабра. Сапраўды паспяховыя людзі маюць актыўную грамадзянскаю пазіцыю, могуць смела выказаць сваю думку, яны клапоцяцца аб грамадстве, у якім яны жывуць, прымаюць удзел у сацыяльным, палітычным, культурным і эканамічным жыцці краіны, думаючы аб паляпшэнні не толькі мясцовай, нацыянальнай, рэгіянальнай, але і глабальнай сітуацыі.



Розныя людзі маюць рознае разуменне поспеху ў жыцці. Мэта некаторых людзей - гэта багацце, улада, слава. Яны ігнаруюць іншых людей, і шукаюць свайго самазадаволення.

Але сапраўдны поспех – гэта калі людзі ўтвараюць дабрачынныя фонды. Сацыяльная служба з’яўляецца вельмі добрай мэтай, бо людзі хочуць зрабіць свет лепшым. Яны служаць сваёй краіне.

Каб быць паспяховымі, мы павінны любіць сваю Радзіму, і кожны павінен рабіць усё магчымае для таго, каб Беларусь стала сапраўды вялікай краінай.

Андрэй Багушэвіч

## Вы будзеце шчаслівымі і паспяховымі толькі тады, калі ў вас ёсць любоў

Мы паспяховыя, калі жывём па Божых запаветах, бо існуе вельмі мала надзеі ў гэтым свеце. Тэрарызм, войны… Нават дзеці забіваюць адзін аднаго, а бацькі грэбуюць сваімі дзецьмі. Жорсткасць сэрца, гвалт, нянавісць, забойствы і карупцыю можна ўбачыць штодзённа. Але ёсць надзея ў гэтым свеце - гэта ласка Божая. Толькі Бог можа даць нам свабоду і сапраўдны поспех. Таму трэба быць шчодрымі і аддаваць не шкадуючы, трэба працаваць без аглядкі на адпачынак або ў чаканні ўзнагароды і трэба любіць самому, калі жадаеш каб цябе любілі.

Які сэнс у дасягненні ўсіх вашых мэтаў у кар’еры, калі вы адчуваеце сябе няшчасным? Вы будзеце шчаслівымі толькі тады, калі ў вас ёсць любоў. Deus Caritas Est - «Бог ёсць любоў». Любоў можа мець і іншыя значэнні. Мы любім нашу Радзіму, нашу сям’ю, нашых свойскіх жывёл. Розныя людзі любяць розную ежу. Кожны хоча быць каханым і мець надзейных сяброў. Але ў першую чаргу мы павінны любіць Бога і іншых людзей і даваць ім усё, што мы самі хацелі б атрымаць. Здаецца, што любоў бацькоў да сваіх дзяцей - гэта сапраўдная любоў. Бацькі працягваюць любіць сваіх дзяцей у добрыя і дрэнныя часы. Гэта падобна на любоў Бога да нас. «Калі я маю дар прароцтва, і ведаю ўсе таямніцы, і маю ўсякія веды, а любові не маю, дык я нішто ... Любоў церпіць доўга, любоў не зайздросціць, не бушуе, не шукае свайго, не раздражняецца. Любоў усё пакрывае, усяму верыць, спадзяецца, усё пераносіць. Любоў ніколі не канчаецца «,-пісаў апостал Павел.

Кацярына Розынка

**Вы не будзеце вельмі паспяховымі ў жыцці, пакуль не атрымаеце добрую адукацыю і не навучыцеся прымаць абгрунтаваныя рашэнні.**

Чалавек не можа быць сапраўдным чалавекам без добрай адукацыі. Адукацыя фарміруе вашу самаацэнку і дапамагае поўнасцю рэалізаваць свой ??патэнцыял. Чалавек з добрай адукацыяй будзе больш упэўнены на працы, а таксама пры ўзаемадзеянні з людзьмі. Мець добрую адукацыю важна для поспеху ў жыцці, таму што людзі, якія маюць добрую адукацыю, зарабляць больш грошай.



Калі чалавек не ў стане разважаць і думаць, то ён будзе мець праблемы на працы.

Мы павінны ведаць, як выкарыстоўваць стратэгію крытычнага, творчага мыслення , умець аналізаваць, сінтэзаваць і ацэньваць інфармацыю, рабіць лагічныя высновы, вырашаць праблемы, улічваючы ўласныя думкі і меркаванні іншых людзей. Мы таксама павінны ўмець абгрунтаваць уласныя перакананні і дзеянні, разглядаць альтэрнатыўныя прапановы.

Мікіта Лысёнак

**Калі вы жадаеце дабіццца поспеху, вы павінны ставіць мэты.**

Пастаноўка мэты дазваляе ўзяць пад кантроль накірунак ў жыцці . Значна прасцей стаць паспяховым, калі ў чалавека ёсць уяўленне, чаго ён хоча дасягнуць. Мы павінны не проста сказаць: «Я хачу» і чакаць, што гэта адбудзецца. Пастаноўка мэтаў з'яўляецца працэсам, які пачынаецца з ўважлівага разгляду таго, чаго мы хочам дасягнуць, і заканчваецца цяжкай працай. Мы павінны ведаць, чаго мы хочам дасягнуць і праз пяць гадоў, і да канца гэтага дня. А людзі часам проста жывуць з дня ў дзень.

Калі мы ставім мэты для сябе, важна пераканацца, што яны важныя для нас, і што ёсць сэнс у іх дасягненні. Матывацыя з'яўляецца ключом да дасягнення мэтаў.

Мы павінны ставіць мэты, якія звязаны з прыярытэтамі ў жыцці, бо мы можам мець занадта шмат мэтаў, прысвячаючы надта мала часу кожнай з іх.

Наша мэта павінна быць яснай і дакладна вызначанай і магчымай у дасягненні.

Бліжэйшая мэта - скончыць школу і здаць экзамены паспяхова, паступіць у ВНУ або адразу пасля школы знайсці добрае працоўнае месца ці заснаваць уласную кампанію.

Затым мы ўсе хочам стварыць шчаслівыя сем'і. Што наконт сацыяльнага асяроддзя, некаторыя з нас хочуць жыць у такіх буйных гарадах, як Лондан, другія хацелі б жыць у сельскай мясцовасці. Мэты, як і густы, розныя.

Дзяніс Бучаль

**Станоўчае стаўленне да жыцця спрыяе поспеху.**

Станоўчае стаўленнне азначае канструктыўнае і творчае мысленне, матывацыю на дасягненне мэтаў, вера ў сябе і здольнасць натхняць іншых. Калі вы паглядзіце на яркі бок жыцця, усё жыццё напаўняецца святлом. Гэтае святло ўплывае не толькі на вас, але і на ўсё наваколлее. Таму трэба ва ўсім шукаць лепшае. Адмоўнае стаўленне кажа: «Вы не можаце дабіцца поспеху». Пазітыўнае стаўленне да навакольнага свету кажа: «Вы можаце дасягнуць поспеху».

Надзея Гінько



**Фізічнае і псіхічнае здароўе - гэта вельмі важная рэч у жыцці.**

Людзі павінны звяртаць больш увагі на сваё здароўе, калі яны хочуць дабіцца поспеху. Калі чалавек вядзе здаровы лад жыцця, ён поўны энергіі. Ёсць тры небяспекі, якія могуць сапсаваць ваша здароўе: курэнне, алкаголь, наркотыкі. Людзі, залежныя ад камп'ютара таксама не могуць быць па-сапраўднаму паспяховымі. Усе разумеюць, што фізічная актыўнасць спрыяе добраму настрою і прыносіць задавальненне.

Генрых Шырэй



**Добрыя камунікатыўныя навыкі з'яўляюцца ключом да поспеху ў жыцці, працы і адносінах паміж людзьмі.**

Усё, што мы робім у жыцці, патрабуе зносінаў. Асабісты і дзелавы поспех часта залежыць ад таго, наколькі добра мы разумеем іншых і як добра нас разумеюць. Так што мы павінны быць сумленнымі, ветлівымі і ўмець знайсці кампраміс, каб стаць паспяховымі.

Сакрат сказаў: «Калі тое, што вы хочаце распавесці пра чалавека, не з'яўляецца ні ісцінай, ні добрым, ні карысным, то не трэба гэтага гаварыць». Пераканайцеся ў фактах, каб не пакрыўдзіць людзей. Існуе старая прымаўка: "Што пасееш, тое і пажнеш".

Камунікацыя - гэта працэс, з дапамогай

якога мы абменьваемся інфармацыяй. Таму мы павінны старацца так ясна, як мы толькі можам перадаць нашы думкі, намеры, мэты.

Трэба глядзець на суразмоўцу і ўважліва слухаць, не перапыняць без прычыны. Кажуць: “Слова – серабро, а маўчанне – золата”. Калі мы выказваемся, мы павінны пазбягаць выкарыстання брудных слоў, што можа дапамагчы нам падкрэсліць шчырасць і надзейнасць нашых зносін. Усё ў чалавеку павінна быць прыгожым, бо ўсё пасылае ў свет паведамленне: тое, як мы апранаемся, наша мова, выраз твару, поза, рухі і тон нашага голасу. Таму мы павінны пасылаць паведамленне поспеху - і свет атрымае яго.

Алёна Васільева

**Творчасць з’яўляецца важным ключом да поспеху ў сучасным свеце** , дзе ўсё так хутка змяняецца.

Творчасць – гэта вынаходніцтва нечага новага. Каб быць творчым, каб зрабіць нешта новае, трэба нешта рабіць, трэба працаваць, прыдумваць новыя рашэнні праблем, нават ставіць новыя праблемы і пытанні. Абмежаваныя рэсурсы і тэхналогіі, якія хутка змяняюцца, - усё гэта бізнес-рэаліі, якія патрабуюць творчых рашэнняў. Таму мы павінны выкарыстоўваць і развіваць нашу фантазію, быць падзіцячы цікаўнымі. Але шмат хто з нас губляе здольнасць да творчасці і пошуку новага з узростам.





Вы калі-небудзь хацелі ўзяць аловак і намаляваць эскіз або напісаць нешта, каб выказаць свае пачуцці? Але ўнутры ёсць сумненні нават перад пачаткам працы? Паспрабуйце прымусіць сябе пачаць, а затым развівайце свае здольнасці, бо гэтак жа хутка, як спартсмен губляе форму без трэніроўкі, вашыя творчыя здольнасці знікаюць, калі вы не працуеце кожны тыдзень, кожны дзень.

Усе ведаюць прыпавесць пра таленты. Мы павінны выкарыстоўваць усе здольнасці, што Бог даў нам. Калі мы выкарыстоўваем нашы таленты мудра, Бог будзе памнажаць іх. Дарэчы, талент – гэта не манета, але маса каштоўнага металу, і адзін талент каштаваў больш $ 1000.

Алеся Лосік

## Тэст: “Хто ты такі?”

**Уважліва паглядзіце на прадстаўленыя малюнкі. Выберыце тое, што прыйшлося вам па душы, і чытайце наш каментар.**

**<u>Квадрат</u>**

Чалавек-“Квадрат” звычайна цярплівы і ўпарты.

**<u>Прамавугольнік</u>**

Прамавугольнік лічыцца часовай, пераходнай формай. Звычайна яе выбіраюць людзі, якія ў дадзены момант незадаволеныя сабой і сваім жыццём і жадаюць змяніць гэтую сітуацыю да лепшага.

**<u>Трохвугольнік</u>**

Узімку і ўлетку, незалежна ад капрызаў надвор’я і “маст-хэваў” сезону, людзі-“Трохвугольнікі” апрануты ў жоўтую майку лідэра. Гэта сапраўдныя “энерджайзеры”.

**<u>Кола</u>**

Чалавек-“Кола” як ніхто іншы ўмее суперажываць і спачуваць, ён лёгка можа прадставіць сябе на месцы іншага чалавека.

**<u>Зігзаг</u>**

«Зігзагі» - асобы творчыя, крэатыўныя, арыгінальныя. Яны часта вынаходзяць нестандартныя хады і рашэнні.

### ПАРАДЫ «ЯК СТАЦЬ ПАСПЯХОВЫМ»



**1. Кінь ўсё бескарыснае. Вызначыся з тым, што будзе карысна ў будучыні.**
**2. Вызвалі галаву ад непатрэбнага смецця. Для новых здзяйсненняў патрэбна светлая галава.**
**3. Займайся самаадукацыяй. Чытай кнігі. Наведвай разнастайныя выставы, падарожнічай, займайся спортам, будзь ўсебакова развітым - гэта вельмі вам дапаможа ў бізнэсе.**
**4. Развівай характар лідэра, логіку.**
**5. Займіся чым-небудзь духоўным.**
**6. Вывучай псіхалогію. Добрыя бізнесмены бачаць людзей наскрозь, бо вдаюць псіхалогію чалавека лепш за любога псіхолага.**
**7. Палюбі грошы і яны палюбяць цябе.**
**8. Мар. Уяўляй мэты, а галоўнае - як ты іх дасягаеш.**
**9. Не слухай людзей, якія кажуць, што нічога не атрымаецца.**

*"Няма такога паняцця, як паспяховы чалавек, які ні разу не спатыкнуўся і не дапусціў памылкі. Паспяховымі сталі людзі, якія дапусцілі памылкі, але затым змянілі свае планы, грунтуючыся на гэтых самых памылках. Я як раз адзін з такіх хлопцаў.”*

*"Толькі наяўнасць мэты прыносіць жыццю сэнс і задавальненне. Мэта спрыяе не толькі паляпшэнню здароўя і даўгалеццю, але таксама дае вам кропельку аптымізму ў цяжкі час.”*

*"Ужо 33 гады я гляджу ў люстэрка кожны дзень і пытаюся ў сябе:*
*«Калі б сённяшні дзень быў апошнім у маім жыцці, ці захацеў бы я рабіць тое, што збіраюся зрабіць сёння?»*
*І калі адказ «Не», я разумею, што трэба нешта мяняць.”*

<u>Стыў Джобс - чалавек, які змяніў сусвет</u>

# БЕЛАРУСЫ І АМЕРЫКАНЦЫ: СПРОБА ПАРАЎНАННЯ

Кожны народ мае свае адметныя рысы. Цікава прасачыць падабенствы і адрозненні паміж беларусамі і амерыканцамі.

Амерыканская культура заснавана на індывідуалізме. У ангельскай мове слова «я» заўсёды пішацца з вялікай літары.

Беларуская культура арыентавана на калектывізм. Беларусы заўсёды падкрэсліваюць, што «я» з'яўляецца апошняй літарай у алфавіце. Такім чынам, іншыя людзі лічацца больш важнымі.

Амерыканцы вельмі ганарацца сваёй краінай і сваёй мовай. Кожны дзень у школах пачынаецца з абяцання вернасці краіне. Адной з прычын, чаму ангельская мова стала міжнароднай з'яўляецца тое, што амерыканцы не захацелі вывучаць эсперанта. І ўвесь свет да іх прыстасоўваецца. "Паважай сябе і астатнія будуць цябе паважаць".

У амерыканскай культуры незалежнасць у прыняцці рашэнняў рэкамендуецца. Барак Абама сказаў: «Амерыканцы з'яўляюцца нацыяй аматараў рызыкі». Людзі разумеюць, што тая ці іншая падзея ў іх жыцці з'яўляецца вынікам іх уласных дзеянняў (за выключэннем форс-мажорных абставін). Амерыканцы вераць у поспех, вядуць барацьбу за поспех і вінавацяць сябе за свае няўдачы.

Беларусы ігнаруюць нацыянальную культуру. Толькі нешматлікія людзі (у асноўным - дэмакратычная інтэлігенцыя) размаўляюць па-беларуску. Здаецца, што беларусаў не 10 мільенаў, а максімум - тысяча. Большасць слаба ўяўляе мінулае свайго народу. Замежнікі кажуць, што ў іх складваецца ўражанне, што ўсім беларусам толькі б паесці, паспаць і паглядзець тэлевізар. Беларусам не хапае жадання жыць лепш і рашучасці нешта змяніць. Вядома, гэта цяжка. Вядома, трэба патраціць шмат сіл і энергіі. Але калі мы самі не захочам, ніхто нам не дапаможа.

Беларусы любяць прыказку «Лепш мець сініцу ў руках, чым жураўля ў небе». Яны заўсёды апраўдваюць сябе. У іх вінаватыя такія знешнія фактары, як удача, лёс, урад і, нават, надвор'е. Гэта знайшло адлюстраванне ў беларускай мове, у такіх выказваннях, як «Ня лес», «Усё, што ні робіцца, - да лепшага», «Час – лепшы лекар», «Ну што ж, бывае!».

Усеагульная амерыканская добразычлівасць, якая выяўляецца ва усмешцы, зрабілася стандартам для ўсяго свету. Амерыканцы ніколі не скардзяцца на жыццё. У Амерыцы вельмі ветлівыя прадаўцы.

Беларусы часта засмучоныя і раздражнёныя. Гэта ўжо стала стэрыятыпам. Могуць нахаміць ў краме. У адказ на рытарычнае пытанне "Як справы?" любяць распавесці пра нейкія праблемы.




Амерыканцы ставіць мэты, умеюць планаваць сваю будучыню і ведаюць, што яны будуць рабіць праз 20 ці 50 гадоў, і ў

іх няма ніякіх сумневаў, што ўсе планы будуць рэалізаваныя. Іх мэты вельмі амбіцыйныя. Жаданне стаць прэзідэнтам успрымаецца нармальна. Амерыканцы схільны ды ўсяго новага, да развіцця індывідуальнасці.

Настальгія - вельмі беларускае пачуцце. Шмат хто ідэалізуе мінулае, якое б яно ні было. Калі гучаць настальгічныя песні пра маладосць, каханне, або паход і вогнішча, усе падпяваюць амаль са слязьмі на вачах. Беларусы гавораць «не кажы «гоп» пакуль не пераскокнуў». Часам яны не вераць у свае сілы, бо ў іх менш свабоды сацыяльнай, фізічнай і эканамічнай. Беларусы схільны да ўсялякасці, абыякавасці да сябе, нядбайнасці да продкаў і дзяцей.

У Амерыцы больш свабоды. У любым зяленым месцы можна зладзіць пікнік або пагуляць з мячыкам. Графіці на сценах лічацца праяўленнем мастацтва, а не вар'яцтва. Інтэр'еры амерыканскіх школ аздоблены дзіцячымі малюнкамі рознага ўзроўню, а не толькі "лепшымі» на нечы погляд.

У той жа час амерыканцы любяць закон і парадак.

У Беларусі - культ парадку і чысціні, але часам здаецца, што ўсё зроблена, каб



ўразіць, а не каб зручна жыць або паказаць чыю-небудзь індывідуальнасць.

Англійская мова мае даволі фіксаваны парадак слоў. Трэба казаць «вялікі чорны кот», а не «чорны вялікі кот», «Я кахаю цябе» , а не «Я цябе кахаю».

Нягледзячы на тое, што ў беларускай мове парадак слоў у сказе вельмі вольны, людзі стрыманыя ў праяўленні пачуццяў. Беларусы спакойныя, працавітыя і дакладныя, таму менавіта ў Беларусі шмат гадзіннікавых заводаў і заводаў вылічальнай тэхнікі.

У Амерыцы ўлада імкнецца працаваць на народ, а паліцыя абараняе правы людзей, бо яны разумеюць, што людзі аплочваюць іх заробак.

У Беларусі некаторыя кіраўнікі вельмі ганарлівыя, ім чамусьці здаецца, што ўсе павінны хадзіць на дыбачках перада імі. Людзі ў Беларусі часта баяцца міліцыі.

Здольнасць да самастойнай працы высока шануецца ў ЗША. Пра гэта сведчаць амерыканскія выразы «Бог дапамагае тым, хто дапамагае сабе сам», «Калі двое мужчын едуць на кані, аднаму трэба сесці ззаду», «Шмат кухараў псуюць булён». Амерыканцы хочуць быць першымі. Конкурс з'яўляецца вельмі важнай часткай жыцця. Права на недатыкальнасць прыватнага жыцця з'яўляецца адным з ключавых аспектаў амерыканскай культуры. У сям'і ў кожнага свой вугал, ў дзяцей свае цацкі. Прыстаўка «сама-self» часта мае станоўчае значэнне ў англійскай мове.

У Беларусі людзі аддаюць перавагу працы ў супрацоўніцтве. У іх ёсць вялікае пачуццё агульнасці. Усім вядома, прыказкі «Адзін у полі не воін», «Адзін за ўсіх і ўсе за аднаго». Беларусы прывыклі да калектыўнай уласнасці і працуюць для агульнага дабра. Поспех калектыва лічыцца поспехам кожнага работніка. А вось павага да асабістай прасторы - тое, чаму беларусам трэба вучыцца. У нашай мове няма эквівалентаў для такіх словазлучэнняў, як «Self-made person». Слова «самаўпэўненасць» ў беларускай мове мае негатыўную канатацыю. У Беларусі прыстаўку "сама" хутчэй асацыююць са словамі, якія называюць грахі.

Амерыканцы будуюць вертыкальную кар'еру, яны мараць стаць топ-мэнэджарамі, а іх новая праца павінна лепш аплачвацца, чым папярэдняя.

Большасць беларусаў задаволена гарызантальнай кар'ерай. Напрыклад, многія настаўнікі не хочуць быць дырэктарамі.

Беларусы шануюць духоўнае развіцце больш чым матэрыяльныя або кар’ерныя поспехі.

Вельмі прэстыжна мець вышэйшую адукацыю ў Беларусі і лёгка скончыць універсітэт, калі плаціш за навучанне. Беларуская сістэма вышэйшай адукацыі складаецца з універсітэтаў, акадэмій і інстытутаў. Яна ўключае ў сябе 42 дзяржаўных і 15 недзяржаўных вышэйшых навучальных устаноў (VNU). Усе вышэйшыя навучальныя установы рускамоўныя. Дарэчы, гэта адна з прычын змяншэння колькасці беларускіх класаў.

Амерыканцы не так імкнуцца атрымаць вышэйшую адукацыю. У Амерыцы адносна лёгка паступіць ва ўніверсітэт, але цяжка яго скончыць.

Амерыканскія студэнты сядзяць па асобку. Такія сталы можна ўбачыць у нашых школах, але ў большасці школ двое сядзяць за адным сталом.

Тыповыя літаратурныя і кінаперсанажы таксама дэманструюць значныя адрозненні ў каштоўнасцях беларускага народа і амерыканцаў.

Большасць беларускіх герояў маюць таварышаў: «брыгада», «братва». На самой справе гэта расійскія «героі», бо беларусы не ведаюць сваіх паэтаў, навукоўцаў, мастакоў. А калі вы ведаеце, тады паспрабуйце адказаць на пытанне: «Каго вядомы пісьменнік Васіль Быкаў назваў Беларусам нумар 1 у свеце?». Дарэчы, гэты чалавек некаторы час жыў і працаваў у Паставах, а праславіўся ён ў амерыканскай касманаўтыцы. Шостага красавіка яму споўніцца 102 гады.


*Барыс Кіт*

Калі нашы машыны ламаюцца, мы звяртаемся да сяброў і сваякоў за дапамогай. Гэта нармальна для нашых студэнтаў, каб спісваць у сваіх сяброў. Беларусы разлічваюць на іншага чалавека. Калі яны нешта робяць, то думаюць, што людзі скажуць.

У амерыканскай культуры героі спадзяюцца толькі на сябе: Супермэн, Бэтмен ... . Калі аўтамабілі ламаюцца, амерыканцы выклікаюць адмысловую службу, а не сяброў. Амерыканцы паводзяць сябе вольна, незалежна ад думкі іншага чалавека, калі тое, што яны робяць законна.

Беларусы больш гасцінныя, яны занепакоеныя, што іншыя людзі думаюць пра ежу, якую яны рыхтуюць. Яны чамусьці хочуць пераканаць гасцей, што трэба многа есці. Асаблівую павагу ў Беларусі аказваюць замежнікам. Калі амерыканцы запрашаць іншых людзей у свае дамы, госці часта прыносяць з сабой ежу.

Для амерыканцаў камунікацыя - працэс, пры якім яны абменьваюцца інфармацыяй. Яны не праводзяць гадзіны за чаем. У Амерыцы кажуць: «Дзеянні кажуць гучней, чым словы». У той жа час яны вельмі адкрытыя, да ўсіх звяртаюцца аднолькава "YOU", не падзяляючы на "ВЫ" і "ТЫ". У Амерыцы адносіны настаўніка і вучня выглядаеюць як сяброўства. Беларускі народ любіць цытаваць фразу «раскоша чалавечых зносін». Беларусы выкарыстоўваюць кожную магчымасць для размоў і могуць гаварыць на працягу многіх гадзін.

У Амерыцы мільянер можа выдатна сябе адчуваць у старой вопратцы. Беларусы судзяць па вонкавым выглядзе, і таму ім падабаюцца гламурныя рэчы. Жанчыны праводзяць шмат часу перад люстэркам.

У канцы хачу засяродзіць увагу на тым, што мы павінны памятаць, што ўзровень калектывізму і індывідуалізму моцна вар’іруецца ад чалавека да чалавека і залежыць ад сацыяльнага асяроддзя і індывідуальных асаблівасцяў.

*Наталля Пракаповіч*

# ЗЫГМУНТ ЧАХОВІЧ - ПАЎСТАНЕЦ, ПАКУТНІК, ДУХОЎНЫ БАЦЬКА ЯНКІ КУПАЛЫ


З.Б.Чаховіч.

Чалавек, які зрабіў вялікі, можна сказаць нават, лёсавызначальны ўплыў на жыццёвы шлях і фарміраванне таленту класіка беларускай літаратуры Янкі Купалы – шляхціц, адзін з кіраўнікоў паўстання 1863 года пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага, ураджэнец маёнтка Сурвілішкі Зыгмунт Чаховіч.

Зыгмунт (Сігізмунд) Бярнардавіч Чаховіч-Ляхавіцкі (1831-1907), нарадзіўся ў Сурвілішках, дзе тады на ўзгорку паміж Вялікім і Малым Сурвілішскімі азёрамі знаходзіўся маёнтак Чаховічаў. Пачатковую адукацыю, напэўна, атрымаў дома, а потым вучыўся ў Віленскім дваранскім інстытуце, які закончыў у 1851 годзе ва ўзросце 20 гадоў. Пасля паступіў у Пецярбургскі універсітэт, дзе ў асяродку патрыятычна настроенай моладзі прасякся ідэямі незалежнасці і вальнадумства, стаў прыхільнікам дэмакратычных поглядаў на дзяржаўнае будаўніцтва. Гэта зблізіла яго з К. Каліноўскім і іншымі аднадумцамі. Ужо ў 1861 годзе ў Камаях ён быў заўважаны ўладамі як ініцыятар антыўрадавых дэманстрацый. У 1862-63 гадах Зыгмунт уваходзіў у склад Літоўскага правінцыйнага камітэта, актыўна ўдзельнічаў у падрыхтоўцы паўстання у складзе групы "чырвоных", быў адным з яго кіраўнікоў. Чаховіч з'яўляўся блізкім сябрам Кастуся Каліноўскага.

Пасля ліквідацыі камітэта Зыгмунт - «экспедытар» віленскага паўстанцкага цэнтра: да яго сыходзіліся ўсе канспіратыўныя сувязі. Ён трымаў у памяці ўсе прозвішчы, адрасы і яўкі, кіраваў зносінамі з мясцовымі падпольнымі арганізацыямі Літвы і Беларусі.

Пасля паразы паўстання Зыгмунт Чаховіч быў арыштаваны 31 ліпеня 1863 года і прысуджаны да растрэлу. Але прысуд «Казнить смертью расстрелянием" генерал-губернатар Мураўёў па просьбе Канстанціна Радзівіла замяніў на 12 гадоў катаргі ў самых цяжкіх капальнях – сібірскіх Нерчынскіх рудніках. У час паўстання і адбываючы пакаранне З. Чаховіч трымаўся годна і высакародна. Вось як успамінае пра яго ўдзельнік паўстання Якуб Гейштор: "Ён [З. Чаховіч] адказваў за ўнутраную перапіску з ваяводствамі, атрымліваў паперы, перадаваў іх нам і ў той жа час рассылаў нашы. З поўнай аддачай, самаахвярна і добрасумленна выконваў свой абавязак; пазней у следчай камісіі, па дарозе ў Сібір і ў ссылцы ён паказаў сябе сумленным чалавекам і гарачым патрыётам. Да інтрыг ніколі не далучаўся; для яго важней быў дабрабыт радзімы, а не дробныя амбіцыі".

Каля 1880 г. Зыгмунт Чаховіч вярнуўся пасля ссылкі ў Беларусь і пасяліўся на сталае жыццё ў маёнтку Малыя Бясяды каля Радашковічаў. Тут ён жыў, зусім не займаючыся гаспадаркай, толькі сваімі кнігамі. Лёс склаўся так, што

ў суседнім фальварку Селішча на той час арандаваў зямлю Луцэвіч, у якога быў сын-падлетак Янка - у будучым вядомейшы паэт Янка Купала. Дык вось, Янка раззнаёміўся з былым паўстанцам і часта наведваўся да яго, каб пагаварыць ды узяць для чытання колькі кніг з багатай бібліятэкі Чаховіча. Купала так характарызаваў гэтага чалавека: „...Памешчык быў ідэаліст, летуценнік... Жыў асобна, куды яму пасылалася ежа, ні з кім не сустракаўся, заўсёды заняты кнігамі». Пра сябе ў той час паэт напісаў: «...У бібліятэцы Чаховіча было шмат прагрэсіўных кніг, якія дапамаглі мне асэнсаваць палітычны лад тагачаснай царскай Расіі і абуджалі незадаволенне гэтым ладам....» І яшчэ: „Дарэчы, я ўспомню тут адну акалічнасць: калі мы жылі ў Селішчы, я пазнаёміўся з адным польскім памешчыкам Сігізмундам Чаховічам у маёнтку Малыя Бясяды Вілейскага павета. Памешчык гэты быў у свой час сасланы Мураўёвым у Сібір, але з цягам часу вярнуўся і жыў бязвыезна ў сваім маёнтку Бясяды. У яго была велізарная бібліятэка, большасцю з польскіх кніг. Вось тут мне і адкрыўся, што называецца, скарб... Яго бібліятэка адкрыла мне вочы на многае, што дагэтуль было невядома. Бываючы ў яго часта, прыносячы яму ў падзяку за кнігі то масла, то сыр, бо таго, што даставалася яму ад жонкі, на пражытак не хапала, гутарылі з ім шмат аб чым, аб чым - цяжка нават успомніць, але больш за ўсё, здаецца, аб польскім паўстанні 1863 года. Часта ён мне выбіраў кнігі для чытання, а іншы раз я сам прасіў такіх або іншых аўтараў. Апрача ўсякага роду паэзіі, якой я больш за ўсё захапляўся, белетрыстыкі, гісторыі і да т. п., у яго першага я пазнаёміўся з нелегальнай літаратурай, больш за ўсё наконт польскага паўстання. Былі гэта выданні кракаўскія, лонданскія, парыжскія і г. д.».

Так сталася, што ўласныя маёнткі З. Чаховіча Мацкоўцы, Крашаны, канфіскаваныя пасля арышту, былі прададзеныя ў 1875 г. за даўгі. Зыгмунт не знайшоў паразумення з гаспадыняй маёнтка, жонкай Анэляй Арамовіч, з якой ажаніўся яшчэ перад паўстаннем у 1859 годзе, і застаўся без сродкаў. У Бесядах ён знаходзіўся хутчэй як кватарант, да таго ж паўлегальна, паколькі ўрад не даў афіцыйнага дазволу на пражыванне.

У канцы жыцця, пасля смерці жонкі, Зыгмунд Чаховіч становіцца ўладальнікам маёнтка. З атрыманай спадчыны ён першым чынам выплаціў вялікія даўгі і пазыкі, узятыя калісьці на паўстанцкія мэты. Зрабіў гэта свядома, нягледзячы на тое, што спаўна за ўсё даўно выплаціў сваім здароўем і жыццём.

Зыгмунт Чаховіч памёр 15 кастрычніка 1907 года. Біяграфічныя звесткі жыцця і дзейнасці Зыгмунта Чаховіча даюць нам усе падставы далучыць гэтага чалавека да шэрагу выдатных асоб Пастаўшчыны. Яго высакароднасць, патрыятызм, прага незалежнасці і справядлівасці, сумленнасць у дачыненні да сябе, сваіх поглядаў, сваіх сяброў – вось тыя станоўчыя якасці, якія могуць служыць узорам у выхаванні сапраўдных патрыётаў незалежнай Беларусі.

Асоба З. Чаховіча натхніла яшчэ аднаго класіка беларускай літаратуры Уладзіміра Караткевіча. Вобраз гэтага неардынарнага чалавека адлюстраваны ў яго п'есе "Калыска чатырох чараўніц", у якой паказаны вялікі ўплыў З. Чаховіча на фарміраванне светапогляду Янкі Купалы.

*Ігар Пракаповіч*


***Поспех***

*Выданне для беларускай моладзі*

Рэдактар: Наталля Пракаповіч

Вёрстка: Ігар Пракаповіч

*Рэдакцыя можа не падзяляць думкі аўтараў друкаваных матэрыялаў*

*Наклад 100 асобнікаў*



Адрас: 211875, горад Паставы, вул. Паркавая, 52. Тэл.: 02155-4-44-75

***e-mail: igarpr@gmail.com***